ТОП-5 ПАРУШЭННЯЎ ІНТЭРНЭТ-КРАМАЎ 3

БАЦЬКІ І ЎЖО ДАРОСЛЫЯ ДЗЕЦІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

12 МАЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 89 (29969)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ТАРАСЕНКА, намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач:

«Мы бачым, што фактычна кожны год узнікаюць новыя захворванні, якія маюць міжнароднае значэнне. Не так даўно мы прайшлі пандэмію COVID-19, летась шмат шуму нарабіла воспа малпаў. У бягучым годзе падобных новых інфекцый не выяўлена, але спіс такіх сур'ёзных і небяспечных для чалавека захворванняў папаўняецца, таму мы заўсёды павінны быць гатовы правесці прафілактыку і аказаць неабходную медыцынскую дапамогу».

Вакол «Азёраў» — па вузкакалейцы

Фота БелТА.

У Гродзенскім раёне ў рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Азёры» распрацаваны маршрут, які спадабаўся як мясцовым жыхарам, так і гасцям. Прыцягвае маршрут сваёй разыначкай — падарожжа па цяжкадаступных месцах адбываецца па вузкакалейнай чыгунцы на ўнікальнай дрызіне. Адна з пераваг вузкакалейкі — магчымасць праклясці яе ў цяжкадаступных месцах, таму турысты могуць забрацца ў нязведаныя месцы. Тэрыторыя заказніка размяшчаецца ў межах Азёрскай водна-ледавіковай нізіны. Спалучэнне азёр ледавіковага паходжання, участкаў нізінных і верхавых балот і далін рэк робіць ландшафт маляўнічым і незвычайным.

КАРАТКА

- **Кампартыя Беларусі падала дакументы ў Мінюст на перарэгістрацыю.**
- Сямейны сельскагаспадарчы праект «Уладар вёскі» стартуе ў Беларусі 15 мая.
- **Перадпрэм'ерныя паказы ваенна-патрыятычных фільмаў будуць арганізоўваць у Брэсцкай крэпасці.**
- Больш за 1 млн шчупакоў выпусцілі ў вадаёмы Мінскай вобласці.
- **Сямейны капітал у Беларусі ў 83 працэнтах выпадкаў датэрмінова выкарыстоўваюць на жыллё.**
- Супрацоўнік універсітэта МНС стаў пераможцам чэмпіянату Беларусі па паўэрліфтынгу.

Сацыяльны аспект

Дзеля здароўя

У Ляхавічах і Драгічыне адкрылі новыя камп'ютарныя тамографы

Першая дэкада мая ў двух райцэнтрах Брэстчыны вызначылася не толькі святкаваннем Дня Перамогі, але і значнымі падзеямі ў галіне аховы здароўя. Бальніцы абодвух раёнаў цяпер маюць сучаснае дыягнастычнае абсталяванне. З розніцай у адзін дзень адбыліся цырымоніі адкрыцця камп'ютарных тамографаў у Ляхавічах і Драгічыне.



Раней, каб зрабіць адпаведнае абследаванне, жыхарам Ляхавіцкага раёна трэба было ехаць у Баранавічы альбо нават у Брэст. А гэта азначала папярэднія запісы, часам працяглы ліст чакання, транспартныя выдаткі, іншыя нязручнасці. Цяпер дыягностыку анкалагічных, хірургічных, неўралагічных і нейрахірургічных захворванняў, а таксама траўмаў можна правесці на месцы. У Ляхавічы на КТ з часам таксама паедуць жыхары Ганцавіцкага і асобных вёсак Баранавіцкага раёна.

СТАР. 3

Прыёмная кампанія — 2023

ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА НА ЦТ ПА ТРОХ ПРАДМЕТАХ ЦІ ПА АДНЫМ?

...якія яшчэ нюансы важна ведаць абітурыентам гэтага года...

10 мая ў краіне распачалася рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне. Упершыню з пачатку правядзення ў Беларусі ЦТ яе тэрміны было вырашана скараціць больш як на тыдзень. Арганізатары ўпэўненыя: часу ў абітурыентаў больш чым дастаткова для таго, каб вырашыць усе пытанні з рэгістрацыяй. Да таго ж пры паступленні на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі здача ЦТ сёлета не патрабуецца. Апошні дзень, калі можна афіцыйна аформіць сваё жаданне на ўдзел у ЦТ, — 1 чэрвеня.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падрабязнасці

Хто атрымліваў забойныя пасылкі?

Абнародаваны даныя аб удзельніках тэрарыстычнай групы па падрыхтоўцы тэрактаў на 9 Мая

Адпаведную інфармацыю агучылі ў фільме-расследаванні АНТ «Забойная пасылка» па матэрыялах КДБ Беларусі аб тым, як украінскія спецслужбы рыхтавалі тэракты на тэрыторыі краіны на 9 Мая.

Збеглага грамадзяніна, які праз сваіх знаёмых у Беларусі спрабаваў арганізаваць тэракты, завуць Валерый Сяргеевіч Водзін. У 2020 годзе ён актыўна ўдзельнічаў у масавых беспарадках, быў заўзятым прыхільнікам «перамен», а далей жыццё ў Беларусі для сябе не знайшоў. Яму 23 гады, нарадзіўся ў Барысаве. Пасля школы працаваў на заводзе і ў краме. Выехаў ва Украіну 5 лютага 2022 года. Цяпер звязаны з украінскімі спецслужбамі, а таксама тэрарыстычным фарміраваннем, якое называюць «каліноўскім».

Як расказалі ў фільме, менавіта ён прасіў сваіх знаёмых забрацъ замаскіраваную пад настольныя электраплиты ўзрыўчатку. Пасылка была дастаўлена ў Мінск з Украіны ў адзін з пунктаў выдачы міжнароднай кур'ерскай службы па складаным маршруце, які ўключаў некалькі краін.

У Мінску тэрарысту ў рэалізацыі яго задум спачатку дапамагла 29-гадовая ўраджэнка Магілёўскай вобласці Вікторыя Волчак. Цяпер яна з'яўляецца падазронай у здрадзе дзяржаве і падрыхтоўцы да здзяйснення акта тэрарызму. «Ён папрасіў сфатаграфаваць, калі я забрала. Я сфатаграфавала, скінула яму ў закрытым выглядзе проста каробку. Потым, калі я прыехала дадому, ён папрасіў зняць на відэа, што там у ёй знаходзіцца. Я адкрыла гэтую каробку вялікую, зняла на відэа. Там былі дзве пліткі электрычныя ў каробках, — расказала яна. — У пачатку сакавіка Водзін Валерый Сяргеевіч прасіў, каб на мой адрас даслалі невялікую пасылку. Я ў яго спытала, што будзе ў пасылцы. Сказаў, там будуць электрычныя плітки».

Вікторыя вучылася ў Нясвіжскім педагагічным каледжы. Апошнія дзесяць гадоў працавала ў салонах сувязі, на аўтазапраўцы, краме. Да затрымання пражывала ў пасёлку Ждановічы Мінскага раёна.

У фільме раскрываюцца ў тым ліку некаторыя інтымныя падрабязнасці з жыцця Валерыя Водзіна. Адзначаецца, што ён нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі, і, як вынікае з даных асабістай перапіскі, «у батальёне чацвёра такіх».

Водзін расказвае Волчак шмат падрабязнасцяў: як ідзе служба, якія заданні, дзеліцца літаральна ўсім адкрытым. «Іх сяброўства дастаткова трывалае, і Водзін, атрымаўшы заданне ад Галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны, ужо ведае, хто забярэ ў Мінску пасылкі», — адзначаецца ў расследаванні.

Аднак зламысніку трэба было не толькі забрацъ пасылкі. Трэба было, каб іх яшчэ і схавалі да вызначанага моманту. Просьбу закапаць плітку Вікторыя Волчак выканаць не зможа, і тады Водзін знойдзе іншых памагатых.

Такой памочніцай стала 24-гадовая Ганна Яўгенаўна Савачкіна, якая нарадзілася ў Мінску. Яна таксама цяпер праходзіць як падазроная ў здрадзе дзяржаве і падрыхтоўцы да здзяйснення акта тэрарызму. «Са мной звязаўся Валерый, папрасіў нейкую пасылку забрацъ і схаваць», — распавядае яна.

Ганна Савачкіна вучылася ў сярэдняй школе, скончыла тры курсы эканамічнага факультэта БДУ, але вучобу не завяршыла. З верасня 2022 года паступіла на першы курс біялагічнага факультэта БДУ, староста групы.

Як расказала дзяўчына, яе малады чалавек паставіўся да просьбы, якая паступіла ад Водзіна, негатыўна і адмоўна: «Ён палічыў, што гэта неадэкватная просьба, сказаў заблакіраваць, не згаджацца, не размаўляць».

«Аня кажа, што ёй трэба з'ездзіць да нейкага чалавека, узяць... Зноў жа не ведаю, пакет гэта ці каробка. І некуды адвезці. Але зноў жа не памятаю: там альбо закапаць яе трэба было, альбо перадаць трэцяму чалавеку. Зразумеў, што падстава. І кажу, што цяпер тым больш, табе ў гэта лезці нельга», — распавёў у фільме Яўген Багданенка, сябар Ганны.

Але дзяўчына адгукаецца на просьбу. «Яна праўкраінскіх пазіцый, ды і Водзін як-ніяк сябар. Тэракт хочуць ажыццявіць у Дзень Перамогі, 9 Мая. Таму ваенная разведка Украіны прыспешвае Водзіна, прадстаўніка бчб-супольнасці, а той у Беларусі настойліва шукае сваіх людзей. І знаходзіць Савачкіну», — тлумачаць матывацыю ўдзельнікаў і сутнасць таго, што адбываецца, аўтары фільма.

У выніку пасля выканання шэрагу дадатковых тэхнічных інструкцый ужо згаданая Вікторыя Волчак 26 сакавіка аддае адну з плітак Ганне Савачкінай. Каб яе забрацъ, тая просіць дапамагчы сваю маці.

Па парадзе Водзіна плітку было вырашана закапаць на адных з могілак. Савачкіна прапанавала «Калодзішчы». Па дарозе туды яна з маці заехала ў садовую краму, купіла лапатку, пальчаткі і прыехала на месца. «Там прыпаркаваліся. Была другая палова дня, цямнела. Аня дастала пакет з багажніка. Я выйшла, пайшла з ёй», — расказала цяпер ужо яшчэ адна падазроная Таццяна Русак.

Пры гэтым, са слоў Савачкінай, яе сябар, у інтарэсах якога яна дзейнічала, «сказаў, што дапаможа захаваць мір паміж Беларуссю і Украінай». Дзяўчыну не збянтэжыла, што фактычна захаваць мір яны спрабавалі з дапамогай тэрору, і яна слепа верыла Водзіну.

Цікава, што зламыснік спрабаваў з дапамогай знаёмых атрымацъ і іншыя звесткі — з вобласці разведданых. «Ён сказаў, што там нічога страшнага няма, запэўніў мяне, што ўсё ў парадку. Таксама, пакуль мы з ім размаўлялі, ён перыядычна цікавіўся ў мяне, як наогул абстаноўка ў Беларусі, ці не відаць нейкай ваеннай тэхнікі, якая перамяшчаецца па горадзе, ці не відаць людзей у форме нейкіх незвычайных, вайскоўцаў беларускіх, расійскіх. І ўвесь час пра гэта пытаўся, яшчэ цікавіўся, ці ёсць у мяне знаёмыя вайскоўцы. З усіх гэтых дыялогаў у мяне склалася меркаванне, што ў каробцы, магчыма, нейкая прылада для адсочвання, для збору інфармацыі, магчыма, нейкая праслухоўка», — распавяла Ганна Савачкіна.

Дарэчы, адзначаюць аўтары фільма, таксама думала і расіянка Дар'я Трэпава, якая 2 красавіка ў Санкт-Пецярбургу прынясе статуэтку на творчы вечар загінулага блогера Уладлена Татарскага. Гэты тэракт таксама арганізавалі ўкраінскія спецслужбы. Іх агентура рыхтавала Трэпаву — тая па заданні збірала інфармацыю, фатаграфавала і здымала відэа розных аб'ектаў. Пасля выканання чарговай «замовы» кураторы патрабавалі фота і пісьмовую справаздачу.

Такую ж справаздачу Савачкіна адашле і Водзіну — геалакацыю і маршрут, фатаграфіі, як яна закапала плітку, падрабязнае месца, як знайсці схованку.

Калі першая плітка была ўжо закапана на могілках у Калодзішчах, другая працягвала знаходзіцца ў кватэры ў Вікторыі Волчак у Ждановічах. Яе забралі пазней, 15 красавіка. Зрабіў гэта яшчэ адзін падазраваны Андрэй Грыгор'еў. Яму 29 гадоў, нарадзіўся ў Мінску. Скончыў сталічную сярэднюю школу і медыцынскі каледж. Да затрымання неафіцыйна працаваў зубным тэхнікам у прыватным стаматалагічным цэнтры.

«На веласіпедзе ехаў да Вікторыі Волчак, у якой знаходзіўся пакет з плітой. Мы пагутарылі крыху там. Не бачыліся, можа, год-паўтара. Я забраў пакет і паехаў на маладзечанскі напрамак да станцыі «Аляхновічы», — расказаў малады чалавек.

Плітку Андрэй схавае на тэрыторыі садовага таварыства «Аўтарамонтнік 124». «Грыгор'еў з Водзіным пазнаёміліся пару гадоў таму ў інтэрнэце. Спачатку зблізіліся на фоне ўзаемных пратэсных настрояў. Перапісваліся, слалі адзін аднаму спасылкі. Потым пачалі адпраўляць пікантныя фота і да сустрэч таксама дайшло. Увогуле, былі партнёрамі, — расказалі ў фільме. — Калі Водзін з'едзе ва Украіну, камунікаваць у інтэрнэце стануць пастаянна. У сакавіку Грыгор'еў не адмовіць сябру ў паслузе — забрацъ электраплітку. Па дарозе ў Аляхновічы ён шле падрабязную фота- і відэасправаздачы і геалакацыю. Водзіну гэта трэба, каб даць справаздачу па заданні перад украінскімі кураторамі. Ніякай дабрачыннасці. За перакідку ўзрыўчаткі і звесткі плацяць».

Як і Савачкіна, Грыгор'еў разумеў, што ён вязе і для чаго. «Навошта хаваць электраплітку ў лясным масіве або на могілках? Каб адночы дастаць яе. І выканаць заданне», — падкрэсліваюць аўтары фільма.

Начальнік галоўнага ўпраўлення спецыяльных экспертыз Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Беларусі Уладзімір Атрашкоў расказаў пра вынікі праведзенай экспертызы канфіскаваных аб'ектаў, якія паступілі з КДБ і былі ў электраплітках: «Нашы спецыялісты ўстанавілі, што ўнутры знаходзіліся рэчывы, гатовыя да зборкі адразу некалькіх выбуховых прылад. Экспертыза паказала, што пластычным рэчывам з'яўлялася С4 амерыканскай вытворчасці. Яго часта выкарыстоўваюць для тэрактаў. Вага рэчыва — каля двух кілаграмаў, і такой колькасці хопіць, каб пусціць пад адхон адразу некалькі цягнікоў».

Усе фігуранты па гэтай справе затрыманы і змешчаны ў СІЗА. Прызналі віну, супрацоўнічаюць са следствам і даюць паказанні. Абвінавачваюцца па артыкуле 289 і артыкуле 356 Крымінальнага кодэкса. Ім пагражае пакаранне аж да смяротнага. Хоць маглі быць вызваленыя ад адказнасці, калі б паведамілі і аказалі садзейнічанне. Яны не ўлічылі таго, што іх жаданне дапамагчы стала злачынным. А Водзін, атрымаўшы заданне ад украінскай разведкі, іх проста выкарыстоўваў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі гарантавалі харчовую бяспеку 1,4 мільярда грамадзян

Аб гэтым заявіў кіраўнік Дзяржаўнага ўпраўлення харчавання і матэрыяльных рэсурсаў КНР Цун Лян, паведаміла ТАСС. «У нас ёсць аснова, умовы і патэнцыял, і мы ўпэўненыя, што ўвесь час цвёрда трымаем у руках «піялу рысу» [маецца на ўвазе неабходны харчовы рацыён. — **Заўв. ТАСС**] для больш як 1,4 млрд кітайцаў, — распавёў ён на прэс-канферэнцыі. — Мы няўхільна захоўваем прыярытэты па забеспячэнні харчовай бяспекі, даём надзейную гарантыю для ўсебаковай мадэрнізацыі сацыялістычнай дзяржавы». Як удакладніў кіраўнік ведамства, за апошнія восем гадоў Кітай штогод выраблялі звыш 650 мільёнаў тон харчовай прадукцыі. «Мы забяспечваем сябе харчаваннем больш як на 100 працэнтаў, збожжавымі — на 95 працэнтаў», — дадаў ён. У сярэднім на аднаго чалавека ў КНР прыпадае па 480 кг ежы ў год, што на 20 працэнтаў перавышае міжнародную норму харчовай бяспекі.

Урад ФРГ выдзеліць федэральным землям мільярд еўра на дапамогу бежанцам

Нямецкі ўрад сёлета выдзеліць федэральным землям дадаткова 1 млрд еўра на дапамогу ў прыёме і размяшчэнні бежанцаў. Пра гэта паведаміў канцлер ФРГ Олаф Шольц на прэс-канферэнцыі па выніках сустрэчы прадстаўнікоў урада Германіі і прэм'ер-міністраў рэгіёнаў па пытанні бежанцаў, перадало ТАСС. Пасля шасці гадзін абмеркаванняў урад ФРГ і федэральныя землі дасягнулі пагаднення аб фінансаванні расходаў на размяшчэнне бежанцаў. «Наша краіна сутыкаецца з сур'ёзнай праблемай», — сказаў Шольц. Грашовыя сродкі пойдуць непасрэдна ў муніцыпалітэты, якія прымаюць бежанцаў. У той жа час Шольц удакладніў, што ў лістападзе будзе прынята рашэнне аб неабходнасці выдзялення дадатковых сродкаў. З прычыны значнага павелічэння колькасці бежанцаў з арабскіх і афрыканскіх краін і прыёму сотняў тысяч украінцаў (сёлета за чатыры месяцы колькасць хадайніцтваў аб выдзяленні прыстанішча павялічылася амаль на 80 працэнтаў у параўнанні з адпаведным перыядам летась) гарады і муніцыпалітэты патрабуюць ад урада больш грошай. Раней міністр фінансаў ФРГ Крысціян Ліндэр выступіў супраць гэтага.

Паліцыя Тэхаса канфіскавала 385 мільёнаў доз фентанілу, здольных забіць усё насельніцтва ЗША

Пра гэта заявіў губернатар штата Грэг Эбат, паведаміла ТАСС. Па словах Эбата, вінаватым у фентанілавым крызісе ў ЗША з'яўляецца прэзідэнт краіны Джо Байдэн. З-за палітыкі адкрытых граніц, якую праводзіць Байдэн, на тэрыторыю Тэхаса незаконна ўвозяцца вялізныя аб'ёмы небяспечнага рэчыва. Раней амерыканскія СМІ пісалі, што ў Злучаных Штатах разгарнулася самая сапраўдная апіёідная эпідэмія. Штогод яе ахвярамі становіцца каля 100 тысяч жыхароў краіны. Фентаніл завозіцца ў ЗША пераважна з Мексікі.

Блізкая ўлада

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 13 мая, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Васілевіч КРАЎЧУК. Тэл. 8 016 226 99 26;

• старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Міхайлавіч СУБОЦІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Яўгенавіч ПЕТРАЖЫЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Кібербяспека

АНЛАЙН-ПАРУШЭННІ — РЭАЛЬНЫЯ ПАКАРАННІ,

АБО ЦІ ТРЭБА ПРЫ АФАРМЛЕННІ ДЫСКОНТНАЙ КАРТКІ ЎКАЗВАЦЬ НАЯЎНАСЦЬ САБАКІ

Кожная чацвёртая скарга на незаконныя дзеянні з персанальнымі данымі ў Беларусі мае дачыненне да сферы гандлю і паслуг. Шмат недарэчнасцяў падчас апрацоўкі асабістай інфармацыі чалавека здараецца ў тым ліку і ў інтэрнэт-крамах, якіх у краіне зарэгістравана амаль 30 тысяч. Пра найбольш распаўсюджаныя памылкі ў галіне расказалі ў Нацыянальным цэнтры абароны персанальных даных (НЦАПД).

Усе інтэрнэт-крамы апрацоўваюць вялізны аб'ём інфармацыі аб сваіх пакупніках, аднак далёка не кожны такі суб'ект аддае належную ўвагу рабоце з асабістымі звесткамі кліентаў. Гэта прыводзіць да сур'ёзных парушэнняў, накшталт уцечкі персанальных даных з шэрагу гандлёвых сетак ці апрацоўкі аддаленых банкаўскіх картак, расказаў **Уладзімір КУЗУРА, начальнік упраўлення кантролю і аўдыту НЦАПД**:

— Цэнтр склаў топ-5 найбольш распаўсюджаных парушэнняў у рэчышчы апрацоўкі даных у рабоце інтэрнэт-крамаў. Ён складзены па выніках праверак, якія праводзяцца Цэнтрам, а таксама па фактах звароташ і скаргаў грамадзян.

1. Званкі і рассылка кліентам (пакупнікам) рэкламных і акцыйных прапаноў тавараў і паслуг. Без згоды пакупніка такія прапановы незаконныя.

2. Адсутнасць свабоднага характару згоды. Падчас афармлення карткі лаяльнасці некаторыя гандлёвыя крамы бяруць агульную згоду на некалькі мэт, якія не звязаныя паміж сабой (у тым ліку на накіраванне рэкламнай рассылкі). Такая згода не з'яўляецца свабоднай і яе атрыманне не адпавядае патрабаванням заканадаўства аб персанальных даных.

3. Празмернасць апрацоўкі персанальных даных (ПД). Асобныя гандлёвыя сеткі для афармлення карткі лаяльнасці патрабуюць звесткі пра ідэнтыфікацыйны нумар, фактычнае месца пражывання, пол і адукацыю фізічнай асобы. Запытваюць таксама інфармацыю пра наяўнасць дзяцей, аўтамабіля, хатніх гадаванцаў. Усе гэтыя даныя — празмерныя адносна заяўленай мэты апрацоўкі ПД. Больш за тое, у згодзе не адлюстроўваюцца правы грамадзян, звязаныя з апрацоўкай іх асабістых звестак, механізм іх рэалізацыі, а таксама наступствы давання згоды або адмовы ад яе давання. Нікому таксама не тлумачыцца, каму і з якой мэтай гэтыя даныя будуць перадавацца. А самае горшае — у шэрагу інтэрнэт-крамаў увогуле адсутнічае палітыка апрацоўкі персанальных даных на сайце.

4. Персанальныя даныя збіраюцца аператарамі з адкрытых крыніц, у тым ліку з узламаных баз даных. Такія аператары не могуць пацвердзіць, што гэтыя звесткі былі распаўсюджаны самім чалавекам або з яго згоды. Выкарыстанне такой інфармацыі — парушэнне.

5. Адсутнасць неабходных ведаў у работнікаў. Многія супрацоўнікі, якія апрацоўваюць ПД, не азнаёмленыя з палітыкай канфідэнцыяльнасці і іншымі лакальнымі дакументамі. Спецыялісты, што адказваюць за ўнутраны кантроль за апрацоўкай ПД, у многіх выпадках не навучаныя, не валодаюць неабходнымі ведамі для абароны асабістых звестак грамадзян. Работа з такой інфармацыяй арганізавана фармальна і з парушэннямі.

НЦАПД праводзіць плановыя, пазапланавыя і камеральныя (без выезду на месца) праверкі дзейнасці аператараў, звярнуў увагу кіраўнікоў інтэрнэт-крамаў Уладзімір Кузура:

— Нядаўна завершана праверка адной з найбуйнейшых гандлёвых сетак, аператар якой цяпер правядзенню работу па ліквідацыі выяўленых парушэнняў. А Цэнтр і надалей будзе ўдзяляць павышаную ўвагу правядзенню кантрольных мерапрыемстваў па выкрыцці заканадаўства аб ПД аператарамі галіны, у тым ліку ў сферы анлайн-гандлю. За непрыняцце мер па забеспячэнні абароны персанальных даных прадугледжана адказнасць і накладанне штрафу.

Уладальнікі інтэрнэт-крамаў, якія апрацоўваюць (і ў тым ліку захоўваюць) персанальныя даныя не менш як дзесяці тысяч фізічных асоб, павінны абавязкова накіраваць на навучанне ў НЦАПД асоб, якія адказваюць за ўнутраны кантроль за апрацоўкай ПД.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Актуальна

РЫБА ДЛЯ СЯБЕ І НА ЭКСПАРТ

Як жыве і развіваецца галіна

У Беларусі сёлета плануюць вырасціць 17 тысяч тон рыбы. Аб гэтым расказала на прэс-канферэнцыі намеснік начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Вольга БАРЭЙША.

Па яе словах, рыбная галіна не стаіць на месцы. «У нас вялікія планы. На 2023 год запланавана атрымаць 17 тысяч тон рыбы ў рамках дзяржпраграмы, у тым ліку адну тысячу тон каштоўных відаў рыб, такіх як лосась».

Вольга Барэйша растлумачыла, што павелічэнне вытворчасці будзе весціся ў асноўным за кошт выхаду на праектную магутнасць, якая ёсць у індустрыяльных рыбаводных комплексаў. Таксама плануецца будаўніцтва новых сучасных індустрыяльных комплексаў да 2025 года.

«2022 год не быў такім актыўна падзейным, як 2021-ы, калі мы абмяркоўвалі два ключавыя ўказы Прэзідэнта: № 284 «Аб рыбалоўстве і рыбалоўнай гаспадарцы» і № 279, накіраванага на фінансавае аздараўленне і стабілізацыю эканамічнага становішча рыбаводных арганізацый. Сёлета мы пакуль назіраем практыку іх прымянення. Што датычыцца лічбаў, то ў 2022 годзе ўсімі суб'ектамі гаспадарання краіны, якія вядуць дзейнасць у галіне рыбаводства, выраблена 12,6 тысячы тон рыбных рэсурсаў, 80 працэнтаў з якіх вырашчана дзяржаўнымі арганізацыямі і 20 працэнтаў — прыватнымі. Натуральна, планавалі крыху больш, але рыба — адчувальны прадукт, схільны да ўплыву мноства фактараў, у тым ліку не залежных ад нас. Гэта ўмовы надвор'я, недахоп вады і гэтак далей», — расказала Вольга Барэйша.

Паводле яе слоў, дасягнуць пастаўленых аб'ёмаў удалося дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы па праграме «Аграрны бізнес Рэспублікі Беларусь».

Як расказала Вольга Барэйша, 2022 год адзначыўся актыўным пашырэннем геаграфіі супрацоўніцтва ў рыбнай галіне. «Так, у мінулым годзе пастаўкі рыбнай прадукцыі вяліся ў 35 краін свету, з іх 25 краін далёкага замежжа і 10 краін СНД. Прыкметна выраслa геаграфія экспарту па рэгіёнах Расійскай Федэрацыі. Рыбная прадукцыя пастаўлялася ў 47 рэгіёнаў Расіі, а найбольшыя пастаўкі прыпадаюць на Маскву, Санкт-Пецярбург, Смаленск, Маскоўскую, Ленінградскую, Самарскую вобласці і Краснадарскі край».

Вольга Барэйша дадала, што ў мінулым годзе працягвалася актыўнае развіццё супрацоўніцтва ў рамках саюзных пагадненняў і ЕАЭС. «2022 год стаў знакавым для пагаднення паміж урадамі Беларусі і Расіі аб супрацоўніцтве ў галіне рыбнай гаспадаркі, якое было падпісана 13 сакавіка 2002 года. Тады пачала работу расійска-беларуская змешаная камісія ў галіне рыбнай гаспадаркі. За 20 гадоў супрацоўніцтва Беларусь і Расія прарабілі вялікую работу па развіцці дружалюбных добрасуседскіх адносін, у тым ліку інтэграцыйнага ўзаемадзеяння».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дзеля здароўя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як вядома, тамограф — даволі вялікі апарат, бездакорнае функцыянаванне якога патрабуе пэўных умоў. Таму папярэдне была праведзена рэканструкцыя памяшкання пад адпаведны кабінет. Рамонт і абнаўленне абышліся раённаму бюджэту ў 497 тысяч рублёў і былі праведзены ў сцісłыя тэрміны. У падрыхтаванае памяшканне даставілі рэнтгенаўскі камп'ютарны тамограф фірмы Siemens, набыты па лініі цэнтралізаваных закупак Міністэрства аховы здароўя. Яго кошт склаў 796 тысяч рублёў.

Павіншаваць ляхавічан са значнай падзеяй прыехаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА**. «Мы працягваем работу па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы нашых медыцынскіх устаноў. Выпрацавалі падыход, які падтрымала Міністэрства аховы здароўя, накіраваны на высокі стандарт аказання медыцынскіх паслуг. За апошнія два гады ў бальніцах вобласці з'явілася пяць новых тамографаў», — сказаў губернатар.

Кіраўнік вобласці падзякаваў урачам за работу, некаторым з іх уручыў граматы і падзячныя пісьмы.

Галоўны ўрач Ляхавіцкай ЦРБ Георгій ХЛЯБОВІЧ лічыць, што тамограф узніме якасць медыцынскай дыягностыкі на новы ўзровень. «Неабходнасць набыцця абсталявання абумоўленая таксама дэмаграфічнай сітуацыяй. У раёне пражывае шмат пажылых людзей. Яны нярэдка хварэюць і маюць патрэбу ў аператыўнай дыягностыцы. Цяпер пацыенты змогуць прайсці яе ў сваёй бальніцы», — заўважыў галоўурач.

А для людзей з Ганцавіч, якія будуць прыязджаць на прыём, ёсць яшчэ адна добрая навіна. Запланавана будаўніцтва новай дарогі, якая скароціць адлегласць паміж райцэнтрамі на 15 кіламетраў (цяпер адлегласць складае 52 кіламетры).

Для работы ў новым кабінеце тамаграфіі падрыхтаваны персанал. Загадчык кабінета Сяргей Памазанскі мае шасцігадовы вопыт работы на падобным абсталяванні ў медустанове Баранавіч. Прайшлі перападрыхтоўку ўрач агульнай практыкі і тры сярэднія медработнікі. Плануецца, што абследаванне будзе праводзіцца ў дзве змены, тамограф маюць намер задзейнічаць таксама ў выхадныя і святочныя дні.

Апарат дазваляе рабіць 64 зрэзы і атрымліваць у далейшым 3D-мадэль органа, які даследуецца, такім чынам спецыяліст убачыць паталогію памерам да аднаго міліметра, што на звычайнай рэнтгенаграме немагчыма, — адзначалі ўрачы.

Такі ж па тэхнічных якасцях і характарыстыках тамограф атрымала Драгічынская раённая бальніца. Да гэтай пары ў бальніцы функцыянаваў тамограф 1997 года выпуску. Яго магчымасці ў выкананні даследаванняў былі абмежаваныя, ды і за чвэрць стагоддзя развіццё тэхнікі зрабіла аграмадны рывок, а тутэйшы КТ даўно маральна ўстарэў. Таму новы 64-зрэзавы апарат выглядае сур'ёзнай заяўкай на новы ўзровень раённай медыцыны.

У драгічынскім кабінеце камп'ютарнай тамаграфіі, як і ў Ляхавічах, папярэдне правялі рамонт і мадэрнізацыю, тут ужо працуюць чатыры ўрачы і восем лабарантаў. Плануецца, што кабінет будзе абслугоўваць таксама пацыентаў з Іванаўскага і Пружанскага раёнаў.

Пасля цырымоніі пераразання сімвалічнай стужкі кіраўнік вобласці Юрый Шулейка пажадаў медыкам Драгічыншчыны поспехаў у рабоце, папрасіў іх заўсёды падыходзіць з душой да справы. А **намеснік міністра аховы здароўя краіны Юрый ГОРБІЧ** адзначыў, што з аснашчэннем раённых бальніц падобным абсталяваннем

медыцынская дапамога становіцца больш якаснай і даступнай.

Дарэчы, драгічынскі — трэці па ліку камп'ютарны тамограф, які запрацаваў у бальніцах Брэстчыны сёлета. Крыху раней такое абсталяванне з'явілася ў Каменцы. Як заўважыў **начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ**, па аснашчанасці прыладамі камп'ютарнай тамаграфіі Брэсцкая вобласць займае другую пазіцыю ў краіне: «Эпідэмія ковіду паказала, што галоўным дыягнастычным крытэрыем было менавіта даследаванне на КТ. Акрамя паставак КТ, абсталяванне для рэанімацыйных аддзяленняў у сістэме аховы здароўя рэгіёна запланавана і вядзецца вялікая работа па паляпшэнні. Сёлета пачнецца будаўніцтва хірургічнага корпуса Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы, гэта самы буйны праект апошніх гадоў. У Пінску ёсць планы ўзвесці інфекцыйны корпус цэнтральнай раённай бальніцы. Корпус, паводле праекта, будзе складацца з двух аддзяленняў, разлічаных на 80 ложкаў. Там правядуць рэканструкцыю кіслароднага аддзялення. Гаворка ідзе пра інфекцыйны цэнтр абласнога ўзроўню, які возьме на сябе дапамогу насельніцтву з Пінскага, Лунінецкага, Столінскага і Іванаўскага раёнаў. У хуткім часе чакаецца ўвод пасля рэканструкцыі шасціпавярховага корпуса дзіцячай абласной бальніцы».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота дадзена Ляхавіцкім райвыканкамам.

ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА НА ЦТ ПА ТРОХ ПРАДМЕТАХ ЦІ ПА АДНЫМ?

БЕЗ ПРОПУСКАЎ НА ТЭСЦІРАВАННЕ НЕ ПУСЦЯЦЬ

Заяву для ўдзелу ў тэсціраванні абітурыент можа падаць як анлайн, так і афлайн. Можна запоўніць электронную форму на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў на адрас www.regct.rikc.by (у сістэме папярэдняй рэгістрацыі) або завітаць у адзін з пунктаў рэгістрацыі, маючы пры сабе дакумент (копію дакумента), які сведчыць асобу. Такім дакументам лічыцца пашпарт, ID-картка, пасведчанне на права жыхарства, пасведчанне бежанца або даведка, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента, які сведчыць асобу. Адрасы і графік работы пунктаў рэгістрацыі размешчаны на сайце РІКВ у раздзеле «Пункты рэгістрацыі і правядзення ЦТ».

У кожным з пунктаў рэгістрацыі абітурыент можа запісацца ў любую ВНУ, дзе яму будзе больш зручна здаваць экзамен. Усё таму, што сістэма рэгістрацыі аўтаматызаваная. І зусім не абавязкова пісаць тэсціраванне ў ВНУ, куды абітурыент збіраецца паступаць. Лепш выбраць месца бліжэй да дому, каб пазбегнуць непрадбачаных сітуацый (спазнення транспарту, забытых дакументаў і г. д.).

Пры афармленні электроннай формы заявы на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў спачатку неабходна ўвесці свае даныя (серыя і нумар дакумента, які сведчыць асобу, нумар тэлефона). Затым прыйдзе SMS з паролем да асабістага кабінета. Ён фарміруецца ў момант першага ўваходу. У наступныя разы трэба будзе толькі ўводзіць лагін і пароль.

Далей у сістэме неабходна выбраць прадметы, пункты тэсціравання і іншыя даныя. **Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар.** Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

На работу пунктаў рэгістрацыі, афармленне дакументаў і правядзенне экзамену.

Абітурыенты са шматдзетных сем'яў здаюць ЦТ бясплатна. Ім трэба прынесці даведку аб месцы жыхарства і складзе сям'і і іх ксеракопіі. Таксама бясплатна рэгіструюцца на тэсціраванне сіроты, інваліды I і II груп, абітурыенты, чые бацькі сталі інвалідамі на ваеннай службе. Падрабязнасці можна даведацца ў 12-м пункце Палажэння аб правядзенні ЦТ.

Абітурыенты, з якіх не спаганяецца плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, не могуць падаць заяўку анлайн. Зрабіць тое трэба асабіста або праз законнага прадстаўніка.

Трэба мець на ўвазе, што **рэгістрацыя завяршаецца атрыманнем пропускаў, па якія трэба звярнуцца асабіста не пазней за 1 чэрвеня.** Абітурыент забірае пропускі ў тым пункце рэгістрацыі, у якім ён падаваў заяву для ўдзелу ў ЦТ пры асабістай яўцы, або ў адным з пунктаў рэгістрацыі, што ажыццяўляюць работу на базе пунктаў тэсціравання, дзе абітурыент плануе праходзіць ЦТ (у выпадку падачы заявы для ўдзелу ў ЦТ праз сістэму папярэдняй рэгістрацыі).

Фота БелТА.

У адзін з іх неабходна будзе завітаць з пашпартам, ID-карткай, пасведчаннем на права жыхарства або пасведчаннем бежанца. Забраць пропускі замест абітурыента могуць таксама яго законныя прадстаўнікі. Менавіта ў пропуску ўказваецца інфармацыя, калі і куды трэба прыходзіць у дзень правядзення тэсціравання. Без пропускаў на тэсціраванне не пусцяць.

ДАВЕДКА

Сёлета ЦЭ будуць здаваць 53 323 выпускнікі. Самым буйным пунктам здачы цэнтралізаванага экзамену стане БНТУ: тут здасць іспыт каля 3 тысяч чалавек. А самым маленькім — Расонская сярэдняя школа ў Віцебскай вобласці, дзе ЦЭ напішуць 60 вучняў.

З дзвюх моў каля 73 % сёлетніх выпускнікоў выбрала рускую (41 781 чалавек). Самым папулярным профільным прадметам стала матэматыка (20 582 чалавекі).

Наступны этап — аплата ўдзелу ў ЦТ праз сістэму АРІП. Правесці аплату трэба не пазней за 1 чэрвеня, выкарыстоўваючы нумар свайго асабовага рахунку, указанага ў асабістым кабінеце сістэмы рэгістрацыі. Гэта сума складае 0,1 базавай велічыні за адзін вучэбны прадмет (3,7 рубля). У кошт закладваюцца выдаткі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абітурыентам трэба быць уважлівымі: **пропуск для ўдзелу ў ЦТ лічыцца зарэгістраваным, калі на ім ёсць пячатка ўстановы, вызначанай пунктам рэгістрацыі на ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар.** У выпадку страты пропуску выдаецца дублікат.

Пакуль абітурыент не атрымаў пропуск, у асабістым кабінеце можна змяніць даныя ў заяве: набор прадметаў, мову прадстаўлення тэста і г. д. Калі з'явіцца неабходнасць тое зрабіць пасля атрымання пропуску, трэба будзе звяртацца ў пункт ЦТ асабіста. Адпаведна, калі ты рэгіструешся афлайн, то і змены ўносяцца ў тым пункце, дзе пісаў заяву. Аднак усе маніпуляцыі магчымыя толькі да 1 чэрвеня (уключна).

У апошні дзень пасля 12 гадзін і да закрыцця пунктаў рэгістрацыі ў 19 гадзін падаць заяву на ўдзел у ЦТ можна будзе толькі асабіста, завітаўшы ў адзін з пунктаў рэгістрацыі. Папярэдняя анлайн-рэгістрацыя на сайце будзе даступная толькі да 12 гадзін 1 чэрвеня.

Галоўнае адрозненне ад папярэдніх гадоў, калі абітурыентам даводзілася рэгістравацца аж на чатыры прадметы на ЦТ, з 2023 года выпускнікі школ папярэдніх гадоў і выпускнікі прафесійных навучальных устаноў могуць зарэгістравацца для ўдзелу ў ЦТ толькі па трох прадметах. А **абітурыентам, якія сёлета здаюць два цэнтралізаваныя экзамены пры выхадзе са школы, дазваляецца зарэгістравацца для здачы ЦТ толькі па адным прадмеце, і гэты прадмет — профільная дысцыпліна для паступлення на тую ці іншую спецыяльнасць. Дзяржаўную мову яны здаюць на ЦЭ.**

СУР'ЁЗНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ІДЭНТЫФІКАЦЫІ АСОБЫ

14 мая ў краіне пройдзе першы ў гісторыі краіны цэнтралізаваны экзамен для адзінаццацікласнікаў. Выпускнікоў прымуць 144 пункты правядзення ЦЭ, з іх 30 размяшчаюцца на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі, 60 — на базе ўстаноў прафесійнай адукацыі і 54 пункты — на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі: гэта школы, гімназіі, ліцэі.

Агульныя прынцыпы правядзення цэнтралізаванага экзамену супадаюць з правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання, але ёсць у яго і свае адметнасці. Адна з іх — спосаб дастаўкі школьнікаў у пункты правядзення ЦЭ. Адзінацікласнікаў будуць дастаўляць туды цэнтралізавана. Загадзя былі сфарміраваныя графікі прыбыцця навучэнцаў у пункты здачы цэнтралізаванага экзамену, каб на ўваходзе ў навучальныя ўстановы не ўтварыліся чэргі.

Першы ў гісторыі краіны цэнтралізаваны экзамен пачнецца 14 мая ў 11.00. Выпускнікі школ прыбудуць у пункты здачы ЦЭ за гадзіну да пачатку выпрабавання. Гэта неабходна, каб дзеці ў спакойнай абстаноўцы, без мітусні маглі заняць сваё месца ў экзаменацыйнай аўдыторыі і скандэнтавацца на адказным выпрабаванні. Адзінаццацікласнікаў размесцяць у шахматным парадку, па адным за партай. У аўдыторыі павінны прысутнічаць не менш як тры педагогі, сярод іх і настаўнік таго прадмета, па якім праводзіцца ЦЭ. Цэнтралізаваны ад'езд школьнікаў таксама захаваецца. У сельскай мясцовасці навучэнцаў павінны даставіць да населенага пункта, дзе тыя пражываюць.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў папярэджваюць, што пры правядзенні цэнтралізаванага экзамену будуць прад'яўляцца сур'ёзныя патрабаванні да ідэнтыфікацыі асобы яго ўдзельнікаў. На ЦЭ, як і на ЦТ, будзе арганізаваны прапускны рэжым. Навучэнцы павінны мець з сабой афармленыя пропускі, а таксама дакумент, які сведчыць іх асобу. Як паказала рэпетыцыя ЦЭ, частка навучэнцаў не мела пры сабе пашпартоў. Між іншым, яны абавязаныя на ўваходзе ў пункт правядзення ЦЭ прадставіць або пашпарт, або ID-карткі, або спецыяльную даведку з органаў МУС з фатаграфіяй і пячаткай у выпадку страты пашпарта. Гэта тыя дакументы, якія дазваляюць вызначыць асобу ўдзельніка выпрабавання. Калі пропуск навучэнцам будзе страчаны, яго можна будзе выпісаць у самім пункце правядзення ЦЭ, такая магчымасць ёсць. Але без пашпарта ўдзельнік да экзамену не можа быць дапушчаны.

КАЛІ НЕ АТРЫМАЕЦЦА ПРАЙСЦІ НА МЭТАВЫЯ МЕСЦЫ...

У пачатку мая на сайтах вышэйшых навучальных устаноў з'явілася інфармацыя аб даступных мэтавых месцах і прадпрыемствах — заказчыках кадраў. Паводле інфармацыі Міністэрства адукацыі, сёлета паступіла каля чатырох тысяч заявак ад прадпрыемстваў краіны на прыём абітурыентаў на мэтавае навучанне: большая іх частка — з рэгіёнаў, але ёсць і заказчыкі з Мінска.

Больш за ўсё запытаў на мэтавікоў ва ўстановах вышэйшай адукацыі, падведамных Міністэрству аховы здароўя. Заявак ад канкрэтных медустаноў няма, бо наперадзе ў будучых медыкаў — доўгія гады навучання, а сітуацыя з кадрамі ў рэгіёнах хутка мяняецца. Па мэтавае накіраванне варта звяртацца ў галоўныя ўпраўленні аховы здароўя вобласці, а ў Мінску — у Камітэт па ахове здароўя. Канкрэтнае месца першай работы выпускніку назавуць толькі на размеркаванні. Так, у БДМУ амаль 65 % бюджэтных месцаў адведзена сёлета пад падрыхтоўку кадраў па мэтавым накіраванні: на лячэбным факультэце — 144 з 240 месцаў, медыка-прафілактычным — 66 са 110, педыятрычным — 144 са 180, фармацэўтычным — 30 з 50, стаматалагічным — 128 са 160.

Прыёмная кампанія для мэтавікоў у 2023 годзе вынесена за рамкі асноўнай прыёмнай кампаніі. Так, з 1 да 5 чэрвеня будзе весціся прыём дакументаў на мэтавыя месцы ў ВНУ, з 6 да 13 чэрвеня пройдуць уступныя іспыты і да 16 чэрвеня адбудзецца залічэнне мэтавікоў. Абітурыенты, якія паступаюць на ўмовах мэтавага накіравання, здаюць адзін унутраны экзамен у ВНУ (у вуснай або практычнай форме) па першым профільным прадмеце абранай спецыяльнасці. Уступны экзамен у практычнай форме праводзіцца для спецыяльнасцяў, дзе профільнымі з'яўляюцца дысцыпліны «Творчасць» і «Фізічная культура і спорт». Конкурс будзе выбудоўвацца на аснове сумы сярэдняга бала дакумента аб адукацыі і бала, атрыманага на ўнутраным экзамене.

14 мая ў краіне пройдзе першы ў гісторыі краіны цэнтралізаваны экзамен для адзінаццацікласнікаў. Выпускнікоў прымуць 144 пункты правядзення ЦЭ, з іх 30 размяшчаюцца на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі, 60 — на базе ўстаноў прафесійнай адукацыі і 54 пункты — на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі: гэта школы, гімназіі, ліцэі.

Калі ў кагосьці не атрымаецца прайсці па конкурсе на месцы, выдзеленыя на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, захоўваецца магчымасць узяць удзел у агульным конкурсе. Для гэтага неабходна не забыцца зарэгістравацца ў маі на ЦТ, здаць усе неабходныя іспыты і паспрабаваць свае сілы ў асноўныя тэрміны прыёмнай кампаніі ў ліпені.

Дарэчы, на сайце Міністэрства адукацыі размешчана інтэрактыўная карта для абітурыентаў, якія плануюць паступаць у ВНУ і каледжы на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Як падкрэсліваюць у ведамстве, дадзены рэсурс дапаможа падабраць месца для вучобы і будучай работы, знайсці кантакты арганізацый — заказчыкаў кадраў па спецыяльнасцях, якія цікавяць, для атрымання дадатковай інфармацыі і заключэння дагавораў з заказчыкамі аб мэтавай падрыхтоўцы. Пакуль карта працуе ў тэставым рэжыме для ўніверсітэтаў Міністэрства адукацыі. Але ў хуткім часе туды плануюць дадаць інфармацыю па ўстановах вышэйшай адукацыі, падпарадкаваных іншым рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання.

Таксама з 10 мая ў Міністэрстве адукацыі пачала працаваць «гарачая лінія» па пытаннях ЦЭ, ЦТ і ўступнай кампаніі. **Патэлефанаваць на «гарачую лінію» па тэлефоне 8 (017) 222-43-12 можна ў будныя дні з 9.00 да 18.00 (абед — з 13.00 да 14.00).** Спецыялісты Мінадукацыі з 10 да 31 мая будуць кансультаваць па пытаннях арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага экзамену, а з 10 мая да 19 жніўня можна будзе задаваць пытанні, якія датычацца ўступнай кампаніі ва ўстановах адукацыі краіны.

Атрымаць інфармацыйную дапамогу па «гарачай лініі» можна будзе і непасрэдна ў дні правядзення цэнтралізаванага экзамену, гэта значыць 14 і 21 мая.

Надзея НІКАЛАЕВА.

З нагоды

140-ГОДДЗЮ ЯНКІ МАЎРА ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

Гэтымі днямі адзначаецца юбілей класіка беларускай літаратуры Янкі Маўра. 140-годдзю пісьменніка прысвечаны шэраг праектаў на канале «Культура» Беларускага радыё.

Пра жыццё і творчасць аднаго з заснавальнікаў айчыннай дзіцячай літаратуры ў сам дзень яго нараджэння ішла гаворка ў перадачы «Дыялогі пра культуру», госцяй якой стала **загадчыца навукова-асветніцкага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Валянціна КАРОТКІНА.** Яна распавяла аб адкрыцці кніжнай выставы ў гонар юбіляра і іншых мерапрыемствах, якія пройдуць ва ўстанове. Праслухаць можна на сайце «Культуры» ці ў сацыяльных сетках радыёстанцыі.

А ў праекце «Дзіцячы радыётэатр» 13 і 14 мая ў 10:05 прагучаць інсцэніраваныя творы «Лацароні», «Слёзы Тубі», а таксама казка Ханса Крысціяна Андэрсана «Новая світка караля» ў перакладзе на беларускую мову Янкі Маўра. У перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя 13 і 14 мая ў 21:30 слухачы змогуць пазнаёміцца з радыёспектаклямі «Палескія рабінзоны» і «Сын вады» паводле аднайменных твораў пісьменніка-юбіляра.

«Янка Маўр — адзін з тых волатаў айчыннай літаратуры, якім па праву ганарыцца наша культура, — адзначыў **намеснік дырэктара канала «Культура», загадчык аддзела музычных і літаратурна-мастацкіх праграм, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.** — І мы ў дні юбілею славутага пісьменніка пастараемся найбольш поўна пазнаёміць слухачоў з творчымі здабыткамі заснавальніка прыгодніцкага жанру ў беларускім прыгожым пісьменстве».

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 191

З 28 красавіка да 7 мая 2023 г. у Турцыі праходзіў чэмпіянат Еўропы па шашках-64 сярод мужчын і жанчын у трох праграмах: бліц, хуткая і класічная гульня. Беларускія шашысты пацвердзілі свой высокі ўзровень і заваявалі дзесяць узнагарод. Ігар Міхальчанка стаў чэмпіёнам Еўропы ў бліцы і хуткіх шашках і атрымаў «бронзу» ў класічнай праграме. У залатым фінале ў хуткай праграме яму супрацьстаяў іншы тытулаваны беларускі гросмайстар Андрэй Валюк, якому для заваявання першага месца неабходная была толькі перамога ў матчы. У першай партыі Андрэю ўдалося перайграць грознага саперніка, аднак у другой Ігар здолеў адыграцца, і нічыя прынесла яму «золата» за кошт больш высокага месца на папярэднім этапе. А. Валюк атрымаў «серабро», затым здолеў яшчэ выйграць медаль такой жа якасці ў класічнай праграме. Абсалютная чэмпіёнка свету Вікторыя Нікалаева ў класічнай праграме на папярэднім этапе фінішавала трэцяй. Аднак праявіла байцоўскі характар і перайграла спачатку ў паўфінале Паліну Петрусёву, якая здаволілася бронзавым медалём. Затым у фінале здолела перамагчы экс-чэмпіёнку свету і Еўропы Алену Скавіціну з Малдовы. Гросмайстар Вера Хвашчынская выйграла залаты медаль у хуткай праграме, а 15-гадовая Дар'я Нікіфарава стала другой. Яшчэ адзін бронзавы медаль заваяваў 15-гадовы Арцём Ціханаў у бліцы.

№ 69



№ 69 В. Нікалаева — Е. Скавіціна

Белыя простыя: a1, c1, b2, d2, f2, d4, h4, c5 (8)

Чорныя простыя: a5, f6, h6, a7, c7, e7, b8, d8 (8)

1...c7-b6? 2. b2-c3! b8-c7 3. a1-b2 h6-g5 4. f2-g3 f6-e5 5. d4:f6 b6:d4 6. c3:e5 g5-f4 7. f6-g7 f4:h2 8. g7-f8 +

Наступныя тры кампазіцыі склаў Анатоль Баланюк (Паўладар, Адэская вобл.)

№ 70

Белыя простыя: a1, c3, g3, b4, d4, h4, c5 (7)

Чорныя простыя: b2, e5, f6, a7, c7, e7, f8 (7)

№ 71

Белыя простыя: e1, d2, g3, b4, f4, g7 (6)

Чорныя простыя: b2, h2, c3, h4, a5, c7 (6)

№ 72

Белыя простыя: a1, c3, e3, g3, d4, f4, e5 (7)

Чорныя простыя: b2, h2, a3, b6, e7, g7, d8 (7)

Наступныя кампазіцыі складзены вядучым рубрыкі.

№ 73

Белыя простыя: f4, e5, d6, e7 (4)

Чорныя простыя: b2, d2, e3, b6, h6 (5)

№ 74

Белыя простыя: c1, b2, d2, f2, d4, f4, h4, g5 (8)

Чорныя простыя: h2, a3, b4, b6, f6, a7, c7, e7, h8 (9)

№ 75

Белыя простыя: b4, d4, f4, c5, b6, d6 (6)

Чорныя простыя: b2, d2, a3, a7, b8 (5)

№ 76

Белыя простыя: c1, b2, d2, h2, d4, d6, c7 (7)

Чорныя простыя: f2, a3, b4, h4, g5, f6, g7, b8 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 190 ад 28.04.2023.

№ 61 1...25-30 2. 34:23 21-27 3. 31:13 08:50+

№ 62 1. 24-19 13:24 2. 29:20 15:24 3. 33-28 22:42 4. 31:04 42:31 5. 26:37+

№ 63 1...24-30! 2. 40-34 20-24 3. 29:20 25:14 4. 34:25 14-20 5. 25:23 18:47 6. 27:18 12:23+

№ 64 1. d4-c5 f8-e7 2. h6:f8 h8-g7 3. f8:h6 f6-g5 4. h6:f4 e5:e1 5. g1-f2 e1:g3 6. c3-d4 a5:e5 7. e3-f4 d6:b4 8. f4:f8 b4-c3 9. f8-g7=

№ 65 1. b4-a5 e1:b4 2. a5:c3 c5-b4 3. a3:a7 g5-f4 4. e3:g5 g3-f2 5. g1:e3 g7-h6 6. e7:c5 h6:d6 7. c1-d2 d6-e5 8. a1-b2 e5-f4 9. b2-c3 f4-g3 10. d2-e3 g3-h2 11. e3-d4 h2-g1 12. d4-c5 g1:b6 13. a7:c5 b8-c7 14. c5-d6 c7:e5 15. c3-b4=

№ 66 1. a5-b6 c7:g3 2. h2:f8 d6:f4 3. f8:h2 b8-a7 4. h2-c7+

№ 67 1. c5-b6 a7:g5 2. h4:b6 d6:f4 3. b6-c7 b8:d6 4. b4-c5 d6:b4 5. a5:e5+

№ 68 1. e3-d4 c3:g3 2. d4-e5 a5:c3 3. c5-b6 f4:d6 4. h2:f8 c3-d2 5. b6-c7 d6:b8 6. f8:e1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Ж. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

НЯЗРУЧНЫЯ ПЫТАННІ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ — НА «БЕЛАРУСЬ 1»

Белтэлерадыёкампанія запусціла ток-шоу для ўсёй сям'і «100 пытанняў даросламу». У ім сталічныя школьнікі задаюць смелыя, нечаканыя і часам вельмі кранальныя пытанні вядомым палітыкам, медыкам, артыстам, спартсменам.

Шоу «100 пытанняў даросламу» — эксперымент, бо яно не мае загадзя распрацаванага сцэнарыя ці вызначанага кола тэм. Вядучы праекта Уладзімір Богдан знаходзіцца па-за кадрам, а ўдзельнікаў, як і тэлегледачы, бачыць з экранаў і сочыць за выкананнем правілаў. А юныя інтэрв'юеры самі вядуць размову з дарослым. Іх цікавяць прафесійная дзейнасць, асабістае жыццё, дзяцінства, адносіны з бацькамі, планы на будучыню і самыя розныя аспекты жыцця знакамітасцяў. Дзеці таксама могуць папрасіць пракаментаваць падзеі, якія іх хвалююць, альбо паразважаць разам над філасофскімі праблемамі.

Наколькі цікавы атрымаецца выпуск, ці будзе ён карысны і захапляльны, залежыць ад госця, ад яго паводзін і гатоўнасці шчыра адказваць на пытанні, бо дзеці вельмі востра адчуваюць крывадушнасць і фальш. Аднак «правілы гульні» праекта дазваляюць пакідаць без адказу да трох пытанняў, хоць і карыстаюцца такой магчымасцю госці вельмі рэдка, таму што імкнуцца быць з дзецьмі максімальна адкрытымі.

